## ДОБРАГА НІКОЛІ НЕ ЗАМНОГА

— Добры дзень, Васілінка! Добрага табе здароўя! Я так рады бачыць цябе! Як твае справы? Як настрой?



— Прывітанне, Лянок! І я рада цябе бачыць! Што гэта ты сёння такі ветлівы?

— Таму што я прачытаў верш «Чатыры пажаданні».

**Апаўдня́** — у сярэдзіне дня.

Паслухайце верш. Пра якія чатыры пажаданні гаворыць аўтар?

## Чатыры пажаданні

*Васіль Вітка*

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей
Раніцай: — Добрага ранку!
І апаўдня: — Добры дзень!



Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць:
— Добры вечар!
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям:
— Дабранач!

1. Якімі словамі вітаюцца людзі раніцай? Апаўдня? Увечары? Якое пажаданне выказваюць нанач?
2. Як называюць чалавека, які ўжывае словы ветлівасці?
3. Прачытайце верш выразна.



Ветлівы чалавек умее паводзіць сябе ў розных сітуацыях. Пакажыце, як трэба паводзіць сябе ў прапанаваных сітуацыях.

1. Сустракаем гасцей.
2. Прыходзім раніцай у клас.
3. Развітваемся пасля ўрокаў.
4. Ідзём увечары адпачываць.

Прачытайце прыказкі. Растлумачце, як вы іх разумееце. Якое слова аб'ядноўвае сэнс гэтых прыказак?

- Сам добры — людзі добрыя.
- Добраму чалавеку ўсюды добра.
- Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе.

Спрача́цца — *рус.*: спорить.
Ма́цаючы — *рус.*: ощупывая.
Суцэ́льны — *тут*: няспынны.

Паслухайце апавяданне. Адкажыце на пытанне аўтара.

## Хто самы добры?

*Аляксей Якімовіч*

Каля пешаходнага перахода на гулкай гарадской вуліцы паспрачаліся сябры-трэцякласнікі Ваня, Пеця і Алесь.

— Я самы добры, — сказаў Ваня. — Я вельмі шкадую старых людзей. Яны часта такія бездапаможныя!

— Я самы добры, — не пагадзіўся з Ванем Пеця. — Я вельмі шкадую адзінокіх старых людзей. Ім іншы раз пагаварыць няма з кім.

— Я самы добры... — пачаў Алесь. Але Ваня перапыніў яго:

— Ты лепей памаўчы. Учора задачу па матэматыцы не даў спісаць. З-за цябе перад настаўніцай прыйшлося апраўдвацца.

— Так, так, — падтакнуў Пеця.

— Самому трэба рашаць задачы. Будзеш спісваць — ніколі матэматыку не вывучыш, — ціха прамовіў Алесь.

З-за рога дома, мацаючы металічным кіем дарогу, выйшла сівая жанчына і накіравалася на пешаходны пераход.



А па дарозе суцэльным патокам машыны імчацца, злосна гудзяць.

— Куды яна ідзе? — усклікнуў Ваня. — Зялёны агонь святлафора яшчэ не загарэўся.

— У яе кепскі зрок! — здагадаўся Пеця. — Мама неяк казала, што людзі з кепскім зрокам заўжды ходзяць з кійком.

Стаяць Ваня і Пеця, дзівяцца. А Алесь падбег да жанчыны і дакрануўся да яе рукі.

— Пачакайце, не пераходзьце дарогу! Зараз я вас пераваду. Вы мне дазволіце?

Жанчына павярнула галаву да хлопчыка і ўсміхнулася. Калі б яна чула нядаўнюю спрэчку, то, напэўна, здагадалася б, хто тут самы добры. І вы здагадаліся?

1. У якім класе вучыліся хлопчыкі? Аб чым яны спрачаліся?
2. Чаму Ваня і Пеця лічылі сябе самымі добрымі?
3. Чаму Ваня перапыніў Алеся?
4. Што зрабілі хлопчыкі, калі жанчына накіравалася на пешаходны пераход? Прачытайце.
5. Хто сапраўды быў самы добры? Чаму?
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне па ролях.